Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2015

## Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага Дню

**6 сакавіка**

Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня ў чытальнай зале прайшоў караван гісторый «Вялікіх жанчын імёны», удзельнікамі якога сталі пражываючыя ў ГУ «Кобрынскі псіханеўралагічны дом- інтэрнат для састарэлых і інвалідаў». Прысутным прапанаваны музычна -паэтычная кампазіцыя «Знаменитые и прекрасные» і кніжная выстава «О, женщина – краса земная». Удзельнікі сустрэчы І. Ліцкевіч, О. Малафеюк і А. Канцэвіч чыталі вершы. У канцы мерапрыемства ўсе запрошаныя атрымалі ў падарунак кнігі.

*ЦБ, 20 чал.*

**8 сакавіка**

Сумесна з Магдалінскім СДК арганізавана выступленне ЛПГ «Маладосць». Да мерапрыемства падрыхтаваны выставы вырабаў Школы народнага мастацтва. Для прысутных гучалі вершы і святочныя віншаванні народнага клуба аматараў фальклору «Магдаліна».

*Магдалінская СБ, 50 чал.*

**10 сакавіка**

Праведзена літаратурная гадзіна «Шчырым словам пра адзіную». Прысутныя прынялі актыўны ўдзел у бяспройгрышнай латарэі, гульні «Кветкавы гараскоп». Са сваімі вершамі выступілі Галіна Балахоўская, Валянціна Дашчук, Тамара Сафронава, удзельнікі гуртка «Літаратурнае слова». У канцы мерапрыемства прадэманстравана відэапрэзентацыя «Беларускія творы святкуюць юбілей», размешчаная на сайце Кобрынскай РЦБС. Завяршылася мерапрыемства ўручэннем памятных сувеніраў і чаяпіццем.

*Астроміцкая СБ, 15 чал.*

## Мерапрыемствы да Дня Канстытуцыі

**12 сакавіка**

Гадзіна прававой інфармацыі «Ведаць. Разумець. Выконваць». Для прысутных прапанавана кніжная выстава «Ведаць. Разумець. Выконваць», экскурс у публічны цэнтр прававой інфармацыі, відэапрэзентацыя «Канстытуцыя ў нашым жыцці» і віктарына «Ведаем, адказваем».

*ЦБ, 25 чал.*

## Мерапрыемствы ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі

**23 сакавіка**

У межах Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі «Цудоўная краіна Бібліятэка» прайшоў Дзень юнага чытача «Вам знаком Книжкин дом?». Удзельнікамі мерапрыемства сталі выхаванцы старэйшай групы «Рамонак» ДУА «Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа». Дзеці пазнаёміліся з бібліятэкай і правіламі паводзінаў з кнігай, прамовілі «клятву чытачоў» і атрымалі ганаровыя чытацкія білеты. Дадому маленькія чытачы пайшлі з добрым настроем, цікавымі кнігамі і салодкімі прызамі.

*Гарадзецкая СБ, 16 чал.*

**23 сакавіка**

Адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі «Мы с любимой детской книгой-неразлучные друзья» правяла Батчынская СБ сумесна з бібліятэкай Батчынскай школы. Удзельнікамі мерапрыемства сталі вучні Батчынскай школы і ўдзельнікі раённага педагагічнага семінара па краязнаўству. Да увагі гледачоў прапанаваны выставы вырабаў «Свет тваіх захапленняў» і малюнкаў «Свет фарбаў – свет дзяцінства». Завіталі на мерапрыемства і героі казак: баба Яга, Нязнайка, Бураціна , Мальвіна і іншыя. Да свята падрыхтаваны выставы кніг «Адкрый для сябе беларускую кнігу», «Наша спадчына – казка беларуская».

*Батчынская СБ, 15 чал.*

**26 сакавіка**

У межах Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі прайшла конкурсна - забаўляльная гульня «На ўсе вашы пытанні разумныя кнігі адкажуць заўсёды». Дзеці пазнаёміліся з бібліятэкай, паўдзельнічалі ў конкурснай праграме, прагледзелі відэаролік «Ералаш . Бібліятэка». Адбылася прэзентацыя кніжнай выставы. У канцы ўсе хлопчыкі і дзяўчынкі атрымалі салодкія прызы.

*Імянінская СБ, 10 чал.*

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**2 сакавіка**

Лукская інтэграваная бібліятэка правяла гадзіну паэта «Паэт мужнасці і дабрыні» да 80-годдзя з дня нараджэння Р.Барадуліна. Прысутныя пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам аўтара. Да ўвагі вучняў прапанаваны відэапрэзентацыя і кніжная выстава «Зямля бацькоў дала мне права».

*Лукская СБ, 10 чал.*

**4 сакавіка**

У межах тыдня папулярызацыі кнігі і чытання сярод жыхароў аграгарадка стартавала акцыя «Заразіўся вірусам чытання сам, заразі другога». Па ўмовах акцыі чытачы запрашаюць у бібліятэку сваіх сяброў, аднагодкаў, аднакласнікаў і членаў сям'і. За кожнага чалавека, які стаў чытачом, удзельнік акцыі атрымлівае бонус.

*Гарадзецкая СБ, 15 чал.*

**11 сакавіка**

Прайшло пасяджэнне клуба «Крыніца» «Душа вясновай пяшчотай дыхае». Для членаў клуба падрыхтавана кніжная выстава «Раскрой свою женственность», святочнае выступленне ЛПГ «Натхненне». Прысутныя падзяліліся сваімі сакрэтамі на тэму «Мая формула прыгажосці» . Мерапрыемства завяршылася чаяпіццем .

*Гарадзецкая СБ, 10 чал.*

**13 сакавіка**

У цэнтральнай бібліятэцы прайшоў навучальны семінар «Бібліятэка і моладзь: грані ўзаемадзеяння». Увазе бібліятэкараў сістэмы прадстаўлены метадычныя матэрыялы АБМ , выданні ў дапамогу працы з моладдзю. У рэжыме онлайн прайшлі відэапрэзентацыі «Пра іх і для іх , сённяшніх і маладых» і «Кожны беларус павінен ведаць». З мэтай актывізацыі работы ў інтэрнэт-прасторы арганізаваны трэнінг «Электронная пошта. Магу. Умею. Практыкую».

*ЦБ, 50 чал.*

**16 сакавіка**

Прайшла прэзентацыя зборніка вершаў Надзеі Іванаўны Момлік «ПРЫЗНАННЕ» , які выйшаў у выдавецтве «Альтэрнатыва». Бібліятэкары прадставілі відэапрэзентацыю «Крыніца творчага натхнення» і аформілі выставу краязнаўчых матэрыялаў «Нашы

вытокі». Аўтар чытала свае вершы, раздавала аўтографы, адказвала на пытанні і дзялілася творчымі планамі.

*Дзівінская СБ, 9 чал.*

## <u>**Выдавецкая дзейнасць**</u>

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана памятка ў дапамогу сельскім бібліятэкам па рабоце з моладдзю «Молодёжь в библиотечном формате».

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены метадычныя рэкамендацыі «Дапамагчы зрабіць правільны выбар» ў дапамогу бібліятэкам па дзейнасці ў перыяд перадвыбарнай кампаніі.

*ЦБ*

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу выдаў метадычныя падказкі сельскім філіялам «Расстановка библиотечного фонда», першае выданне з серыі «Асновы дзейнасці сельскай бібліятэкі».

*ЦБ*

Бібліёграфамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі выдадзены інфармацыйна-бібліяграфічны бюлетэнь «Водныя шляхі Кобрынскага краю». Гэта першы выпуск з цыкла «Па старонках календара нашай памяці». Бюлетэнь прысвечаны каналам, якія знаходзяцца ў межах Кобрынскага раёна і з'яўляюцца юбілярамі 2015 года.

*ЦБ*

Выканаўца:
Гал. бібліятэкар ОБМ
Мілашук Т.І.
Тел. 23681